http://www.polymia.by/2019/01/predstavitel-kluba-belyj-tigr-kirill-artyux-privez-s-respublikanskix-sorevnovanij-po-kata-dva-serebra/







# ПРЕДСТАВИТЕЛЬ КЛУБА «БЕЛЫЙ ТИГР» КИРИЛЛ АРТЮХ ПРИВЕЗ С РЕСПУБЛИКАНСКИХ СОРЕВНОВАНИЙ ПО КАТА ДВА СЕРЕБРА

**28.01.2019 Марына Казловіч**

**🏆 26 студзеня ў Мінску прайшлі Рэспубліканскія спаборніцтвы па ката пад сімвалічнай назвай «Буслік: прыгажуня зіма». Буслік з'яўляецца сімвалам таго, што спартыўныя адзінаборствы імкнуцца да захавання міру і жыцця, прывіваюць шанаванне да роднагам краю.**

У спаборніцтвах узялі ўдзел 116 спартсменаў – прадстаўнікоў клубаў **Беларускай федэрацыі шатакан каратэ-до** ва ўзросце ад 5 да 18 гадоў катэгорый з 10 па 1 кіу.



Прадстаўнік **Карэліцкага маладзёжнага спартыўнага клуба «Белы тыгр» Кірыл Арцюх** (вучань 6-га класса Баранавічскай сярэдняй школы) заняў другое месца ў катэгорыі 12-18 гадоў 6-4 кіу і другое месца у катэгоры 12-18 гадоў 3-1 кіу.

Поспех Кірыла — гэта вынік яго настойлівых трэніровак. Важна тое, што юны спартсмен шмат працуе над сваім майстэрствам як у клубе з таварышамі, так і самастойна. Вялікую падтрымку аказваюць яго бацькі, якія заўсёды побач з Кірылам на спаборніцтвах.



Спадзяёмся, што і далей наша юныя спартсмены будуць дэманстраваць такія поспехі. У лютым яны змогуць праявіць сябе на рэгіянальных спаборніцтвах “Зіма-2019”, таксама 2 лютага – у Зэльве, 17 лютага — на рэспубліканскім “Кубку Абаронцы” у Ваўкавыску.

23 лютага ў Карэлічах плануецца правесці клубны турнір па кумітэ, прысвечаны Дню Абаронцы Айчыны, дзе кожны ўдзельнік клуба зможа паказать свае навыкі спартыўнага адзінаборства шатакан каратэ-до.

**Аляксандр АБАДЗІНСКІ, кіраўнік клуба “Белы тыгр”**